# З юбілеем!



## Ігнацюк
## Алена Аляксандраўна

Кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры міжкультурных
камунікацый

## *Віртуальная выстава навуковых і творчых прац*

# Ігнацюк Алена Аляксандраўна–

літаратуразнаўца, кандыдат філалагічных навук, член Саюза беларускіх пісьменнікаў



***Навуковыя інтарэсы:***

філалогія; беларускае літаратуразнаўства; мастацтвазнаўства; методыка выкладання беларускай літаратуры ў вышэйшай школе; краязнаўства; эстэтыка; культуралогія; філасофія

***Пазапрафесійная дзейнасць:*** літаратурная творчасць(паэт), псеўданім – Дора Гуш

# Біяграфія і этапы прафесійнай дзейнасці

***Ігнацюк Алена Аляксандра˘на*** нарадзілася ў в. Асаўцы, Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці.



**У 1983 годзе** скончыла філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна па спецыяльнасці «Руская мова і літаратура» і працавала настаўнікам у Белінскай сярэдняй школе Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці.

**У 1999** годзе скончыла аспірантуру Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта ім. А. С. Пушкіна.

**У 1999** годзе абараніла кандыдацкую дысертацыю па літаратуразнаўству «Колер, прастора і час у сучаснай беларускай паэзіі (на прыкладзе творчасці А. Разанава, Я. Сіпакова, Л. Дранько-Майсюка, Я. Янішчыц, У. Арлова)».

# Біяграфія і этапы прафесійнай дзейнасці



**У 1998 – 1999** гадах выкладала ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. С. Пушкіна.

**У 1999 годзе** – праца ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Я. Коласа.

**З 2000 па 2004 год** – старэйшы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф. Скарыны (г. Мінск).

**З 2004 па 2006** год – праца ў Пінскім дзяржаўным вышэйшым банкаўскім каледжы Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь.

**З 2006 года** – дацэнт кафедры гуманітарных навук, філасофіі і права эканамічнага факультэта Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта (з 03.2020 – факультэт эканомікі і фінансаў, кафедра міжкультурных камунікацый, дацэнт).

# Навуковыя выданні

**Атлантыда палескай гісторыі Аляксандра Ільіна** / уклад., прадм., пасляcл. **А. Ігнацюк**. – Мінск: Кнігаабзор, 2021. – 292 с.: партр.

Кніга прысвечана Аляксандру Львовічу Ільіну (1956 – 2020) – матэматыку-навукоўцу (кандыдату фізіка-матэматычных навук), вядомаму пінскаму гісторыку і краязнаўцу.





Летуценны рамантык... Умеў прачытваць сімвалы матэматыкі на мове эстэтыкі, а лічбы спалучаць з «музыкай Нябёс» — адсюль незвычайна тонкае адчуванне ім гармоніі рэальнага быцця... Ён паскорана працаваў і жыў, нібыта ў рытме прыгожага вальса, які закруціў-заваражыў і ўзняў яго да самага сапраўднага духоўнага Узвышша, з якога ён мог ясна ўглядвацца ў твары тых людзей, з мінулага, якія ў выніку пэўных чыннікаў былі забытыя, і ён выводзіў іх з небыцця ў сваіх гістарычных і краязнаўчых тэкстах.



# Навуковыя выданні

**Ігнацюк, А. А. Сармацкі партрэт сучаснікаў Льва Сапегі** / А.А. Ігнацюк // Леў Сапега (1557—1633 гг.) і яго час : зборнік навуковых артыкулаў / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я. Купалы»; рэдкалегія: С.В. Марозава [і інш.]. – Гродна, 2007. – С. 324 – 328.







**Ігнацюк, А. А. Філасофскі экспромт У. Калесніка** / А. А. Ігнацюк // Пасланец Праметэя : кніга пра Уладзіміра Калесніка: [успаміны, эсэ, артыкулы, нататкі, мініяцюры, вершы] / Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А. С. Пушкіна, Навукова асветны цэнтр імя У. Калесніка. – Брест : БрДУ, 2007. – С. 152 – 154.

# Навуковыя выданні

**Ігнацюк, А. А. Сімвалічныя формы прыроды ў творах кітайскіх (сярэдневяковых) і беларускіх (сучасных) мастакоў-пейзажыстаў** / А. А. Ігнацюк // Пути Поднебесной : сб. науч. трудов: в 2 ч. – Минск, 2006. – Вып. 1. ч. 2. – С. 242–245.




**Ігнацюк, А. А. Творы кітайскіх мастакоў (паэтаў, жывапісцаў) у паэзіі М. Танка** / А. А. Ігнацюк; отв. ред. А. Н. Гордей; зам. отв. ред. У. Хунбинь // Пути Поднебесной : сб. науч. статей. – Минск, 2006. – Вып. 1, ч. 2. – С. 246–248.




**Ігнацюк, А.А. Матывы «Пікавай дамы» ў аповесці У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха»/А.А. Ігнацюк** //А.С. Пушкін і Беларусь: зб. нав. арт.; пад рэд. А. Мальдзіса. – Мінск: Беларуская навука, 1999. – С.181–182.

# Навучальныя і вучэбна-метадычныя выданні

**Ігнацюк, А. А. Жывапіс словам: сінтэз паэзіі і жывапісу** : вучэбна-метадычны дапаможнік / А. А. Ігнацюк ; УА «Палескі дзяржаўны універсітэт». – Пінск: ПалесДУ, 2011. – 124 с.: іл.

**Ігнацюк, А.А. «Асветніцкія традыцыі Францыска Скарыны і сучаснасць»:** праграма факультатыўнага курса для вучняў старшых класаў /А.А. Ігнацюк // Роднае слова. – 2001. – № 9. – С. 65 –73.




Роднае слова
штомесячны навуковы і метадычны часопіс

# Навучальныя і вучэбна-метадычныя выданні



**Игнатюк, Е.А. Культурология** : электронный учеб.-метод. комплекс : специальность 1-31 01 01 «Биология (по направлениям)» / Е.А. Игнатюк, В. Л. Лозицкий, О.А. Гринь. – Пинск : ПолесГУ, 2017. – Режим доступа: https://rep.polessu.by/handle/123456789/11643.

**Игнатюк, Е. А. Теория и история мировой культуры** : электронный учеб.-метод. комплекс : специальность 1-89 01 01 «Туризм и гостеприимство» / Е.А. Игнатюк, В.Л. Лозицкий, О.А. Гринь. – Пинск : ПолесГУ, 2017. – Режим доступа: https://rep.polessu.by/handle/123456789/11645.

**Игнатюк, Е. А. Межкультурная коммуникация** : электронный учеб.-метод. комплекс / Е. А. Игнатюк, В. Л. Лозицкий, Е. О. Солоневич. – Пинск : ПолесГУ, 2016. – Режим доступа: http://rep.polessu.by/handle/112/10426.

# Артыкулы ў навуковых і навукова-метадычных часопісах







**Игнатюк, Е. А. Передача сцен «изгнания из рая» и поиски подобия потерянного рая в литературе и живописи** / Е. А. Игнатюк // ЕВРАЗИЯ: духовные традиции народов : рецензир. науч. журнал. – 2012. – № 1. – С. 222-229.

**Игнатюк, Е. А. Поэзия Рыгора Бородулина в системе христианских ценностей** / Е.А. Игнатюк // ГОСУДАРСТВО, РЕЛИГИЯ, ЦЕРКОВЬ В РОССИИ И ЗА РУБЕЖОМ : науч. информ.-аналит., культ.-просвет. журнал. – 2010. – № 1. – С. 103-116.




**Игнатюк, Е. А. Эстетическая потребность: красота «формы»** / Е. А. Игнатюк // Вестник Полесского государственного университета. Серия общественных и гуманитарных наук : науч.-практ. журнал. – 2008. – № 2. – С. 20-27 : цв. ил.

# Артыкулы ў навуковых і навукова-метадычных часопісах




**Ігнацюк, А.А. Герменеўтычнае прачытанне твораў А. Разанава** (частка 1-я) /А.А. Ігнацюк // Роднае слова. – 2003. – № 12. – С. 60 – 63.

**Ігнацюк, А.А. Герменеўтычнае прачытанне твораў А. Разанава** (частка 2-я) /А.А. Ігнацюк // Роднае слова. – 2004. – № 3. – С. 57 – 60.

**Ігнацюк, А.А. Герменеўтычнае прачытанне твораў А. Разанава** (частка 3-я) /А.А. Ігнацюк // Роднае слова.– 2004. – № 12. – С. 45 – 48.



# Артыкулы ў навуковых і навукова-метадычных часопісах







**Ігнацюк, А.А.** **Паэзія, сінтэзаваная кіно: творчасць Я. Коласа** /А. А. Ігнацюк // Мастацтва. – 2000. – № 3. – С. 46 – 49.

**Ігнацюк, А.А.** **Уладзімір Калеснік – фатограф-пейзажыст. Ген гармоніі** /А. А. Ігнацюк // Мастацтва. – 1998. – № 11. – С.51–55.

**Ігнацюк, А.А.** **Стыль дэкору, або ўзорыстыя «дываны» ў паэзіі Я.Янішчыц** /А. А. Ігнацюк // Мастацтва. – 1998. – № 3.– С. 68 –70.

**Ігнацюк, А.А.** **Вершаваны нацюрморт Л. Дранько-Майсюка** /А.А. Ігнацюк //Мастацтва. – 1997. – № 6. – С. 73 –76.






# Артыкулы ў зборніках матэрыялаў канферэнцый



**Ігнацюк, А. А. Праблема дабра і зла ў кантэксце хрысціянскага веравучэння (на прыкладзе аповесці Максіма Гарэцкага «Дзве душы»)** : доклад, тезисы доклада / А. А. Ігнацюк // Устойчивое развитие экономики: состояние, проблемы, перспективы : сб. тр. XI междунар. науч.-практ. конф., г. Пинск, 21 апреля 2017 г. / Мин. образ. РБ [и др.]; редкол.: К.К. Шебеко [и др.]. – Пинск : ПолесГУ, 2017. – С. 294-296.




**Ігнацюк, А. А. Ідэалы фаустаўскага чалавека ў паэзіі Я. Коласа** : доклад, тезисы доклада / А. А. Ігнацюк // Каласавіны: Творчая спадчына Якуба Коласа ў парадыгме грамадска-інтэлектуальнага асяроддзя пісьменніка : матэр. міжнар. навук. канфер., прысвеч. 125-годдзю з дня нарадж. народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, Мінск, 30 кастрычніка 2007 г. – Мінск: Лазурак, 2008. – С. 165-171.

**Ігнацюк, А. А. Канцэпцыя асобы і фантасмагорыя ў «Казках жыцця» Я. Коласа** : доклад, тезисы доклада / А. А. Ігнацюк // Каласавіны: Якуб Колас і яго акружэнне : матэр. навук. канф., прысвеч. 50-й гадавіне смерці народнага паэта Беларусі Я. Коласа, 3 лістапада 2006 г., Мінск / сост.: З. М. Камароўская, Г. І. Зайцава. – Мінск: Выдавецкі цэнтр Бел. дзярж.універсітэта, 2007. – С. 125-129.

# Артыкулы ў зборніках матэрыялаў канферэнцый



**Ігнацюк, А.А. Лірычнае прачытанне тэмы «Палессе» ў творах мастакоў Драгічыншчыны** /А.А. Ігнацюк // Пинск в современной Беларуси: тезисы докладов науч.-практ. конф. молодых учёных Пинщины, Пинск, 21 мая 2004 г. / рец.: Г. Л. Нефагина [и др.]. – Пинск, 2004. – С. 71–73.

**Ігнацюк, А.А. Жывапісная культура Заходняга (Брэсцка–Пінскага) Палесся ва ўмовах глабалізацыі** /А.А. Ігнацюк // Міжкультурны дыялог у Беларусі: нацыянальна-культурнае і духоўнае развіццё ва ўмовах глабалізацыі: матэр. міжн. навук.-практ. канф., Мінск, 10–12 снежня 2003 г. / Нацыянальны навукова-асветны цэнтр імя Ф. Скарыны; рэдкал.: В. Рэвяка [і інш.] – Мінск, 2004.– С. 247– 249.

**Ігнацюк, А.А. Тэма «белага снегу і белых кветак» ў творах японскіх сярэдневяковых паэтаў і беларускіх творцаў (паэтаў, жывапісцаў)** /А.А. Ігнацюк // Беларусь–Японія: матэр. другіх міжн. чыт., прысвеч. памяці І. Гашкевіча.– Мінск–Астравец, 9–10 кастрычніка 2002 г. / Таварыства «Беларусь-Японія» [і інш.] ; пад рэд. А. Мальдзіса. – Мінск: 2003. – С.86–90.



# Публікацыі ў суаўтарстве з А.Л. Ільіным

Ильин, А. **Полесские Скирмунты в архивных документах** / уклад. **А. Ігнацюк**. – Пінск: [б. и.], 2021. – 164 с.: партр., іл.






Да ўвагі чытача шэраг артыкулаў, у тым ліку раней неапублікаваных, пра вядомы палескі род Скірмунтаў.

# Публікацыі ў суаўтарстве з А.Л. Ільіным

Ильин, А. **Непростые и загадочные судьбы братьев Русецких и их потомков** : [монография] / А. Ильин, **Е. Игнатюк**. – Пінск: [б. и.], 2020. – 163 с.: портр., цв. ил.










Ильин, А. Л. **Очерки истории культуры Пинщины (IX - нач. XX вв.)** : [монография] / А. Л. Ильин, **Е. А. Игнатюк**. – Пинск : ПолесГУ, 2013. – 220 с.

# Публікацыі ў суаўтарстве з А.Л. Ільіным










Ильин, А. Л. **Библиотека и архив Дятловичского Спасо-Преображенского монастыря** / А. Л. Ильин, **Е. А. Игнатюк** // Берасцейскія кнігазборы : праблемы і перспектывы даследавання : Матэр. і дакл. II Міжнар. навук.-практ. канф., Брэст, 31 мая - 3 чэрвеня 2012 года / Брэсц. абл. выкан. камітэт, Брэсц. абл. бібл. імя М. Горкага, Брэсц. Дзярж. ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна ; пад агульн. рэд. М. В. Нікалаева. – Брэст : БрДУ, 2013. – С. 278 – 294.

Ильин, А. Л. **Учительские дороги Якуба Коласа на Пинщине** / А. Л. Ильин, **Е. А. Игнатюк** // Каласавіны. Якуб Колас і яго сучаснікі: да вывучэння творчых і асабістых узаемасувязей пісьменніка: матэр. XXVI навуковай канф., 4 лістапада 2011 / склад.: З. М. Камароўская, Г. І. Зайцава. – Мінск: Ковчег, 2012. – С. 102–113.

**Игнатюк Е.А. Судьба библиотеки и архива молодовско-поречских Скирмунтов** / А.Л. Ильин, Е.А. Игнатюк // Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання: матэр. міжн. навук.-практ. канф., Брэст, 30-31 кастрычніка 2008 г. / Ук. «Абласная бібліятэка імя М. Горкага»; склад.: А. М. Мяснянкіна, Т. С. Кавенька. – Брэст: Паліграфіка, 2010. – С. 168 – 172.

# Творчасць

**Ігнацюк Алена Аляксандраўна** (Дора Гуш) – аўтар паэтычных кніг **«Нота Ля»** (2000),**«Летаргія»** (2006), **«Будзе ўсё наадварот»** (2016), **«Дыярыуш для дзівалова: зімовая фантасмагорыя»** (2018), **«Такі, як Неба»** (2021).

*Яе паэзія – гэта неўтаймаваная фантазія душы, пераплаўленая ў гранічныя формулы слоўных метафар, якія ніхто ніколі не чуў і без яе ніколі б не пачулі. Фантазія для яе – рэчаіснасць, стан існавання. Уменне злавіць няўлоўнае, зразумець невыказнае – гэта дар Алены Ігнацюк, яе багацце, яе трывогі, праблемы.*



*“І ўсё ж не схільны сцвярджаць, што свет Алены Ігнацюк надуманы штучна. Не, ён таксама, як і наш рэальны зямны свет, нажыты. Нажыты духоўнымі намаганнямі аўтара. Бо мазалі на нашых руках – гэта не адзіная праўда пражытага жыцця...”*

Л. Галубовіч “Той свет, дзе можна жыць”

# Творчасць



Паэзіі **Алены Ігнацюк** характэрны філасофская глыбіня, хрысціянская духоўнасць, рамантычная мэтаімкнёнасць, любоў да Беларусі і беларускай культуры. Вядомы літаратуразнавец, прафесар Алесь Бельскі назваў яе паэзію імпрэсіяністычнай і неарамантычнай.

Важнае месца ў творах Алены Ігнацюк займае тэма роднай вёскі Асаўцы (паэтычная краіна ″Асавенія“), якая знаходзіцца ў глыбіні Палесся – у паўднёвай частцы Драгічынскага раёна. Творы, прысвечаныя роднай вёсцы, прасякнуты любоўю да народной культуры, да простых людзей-палешукоў.

Вершы паэтэсы перакладены на рускую, польскую, украінскую, шведскую мовы. Паэзія Алены Ігнацюк вельмі меладычная. На яе вершы стварылі песні вядомыя беларускія кампазітары: Генадзь Ермачэнкаў, Броніслаў Сармант і інш.











# Творчасць

**Такі, як неба…**

*І толькі ты –*
*такі, як неба…*
*Да Бога блізкі, бачыш рай.*
*І толькі мне…*
*паверыць трэба,*
*што мне ты дорыш небакрай.*
*Мяне ты водзіш па канаце*
*над срэбнай ранішняй ракой…*
*І па якой патрэбнай плаце*
*нас не кусае пчолаў рой?*
*За неба, нібы за хусціну,*
*трымаемся – і ты, і я…*
*І пойдзе дождж… А праз хвіліну*
*на край мы ступім лугаўя.*
*Ты вучыш блізкай быць да неба*
*мяне – як быццам лётаць ў снах…*
*І толькі нам паверыць трэба,*
*што небакрай – як КРЫЛАЎЗМАХ…*
*Паміж нябёсамі і лугам*
*праходзіць сонечны цягнік.*
*Бяжыць у рай, зусім без гукаў.*
*І толькі ты, як неба слых.*

**Ігнацюк, А. Такі, як Неба. Светлай памяці Аляксандра Львовіча Ільіна**: вершы / А. Ігнацюк. – Крэменец-Пінск, 2021. – 20 с.: іл.




Кніга вершаў Алены Аляксандраўны прысвечана памяці яе мужа, беларускага гісторыка-краяведа, матэматыка, літаратуразнаўца і публіцыста, грамадскага дзеяча А. Л. Ільіна.

# Творчасць

**Гуш, Д.** **Дыярыуш для дзівалова : зімовая фантасмагорыя** / Дора Гуш. – Мінск : Кнігазбор, 2018. – 83 с.



*На старонках кнігі Дора Гуш раскрывае сваю душу і жыццё ў правінцыйным Пінску – сталіцы Палесся. Для гэтага яна выкарыстала жанр фантасмагорыі, як у казках Э.Т.А. Гофмана. Яшчэ ў свае фантасмагарычныя дзённікавыя запісы аўтар дадала трохі і просценька-іранічнай Паэзіі.*



# Творчасць




У вершах гэтай кнігі рэальнасць трапляе ў свет фантазіі лірычнай гераіні і набывае адваротны змест, нечаканыя формы. Для філасофскага асэнсавання быцця, для пошукаў ідэальнага хараства, для размовы з паэзіяй паэтка абрала імпрэсіяністычную манеру пісьма, асацыятыўную вобразнасць і галоўнае — шчырасць.




**Ігнацюк, А.А.** **Будзе ўсё наадварот** : вершы / А. Ігнацюк. – Мн. : Кнігазбор, 2016. – 95 с. – (Кнігарня пісьменніка ; вып. 79).

# Творчасць

**Ігнацюк, А. Летаргія** : [вершы] / Алена Ігнацюк. – Мн. : Беларускі кнігазбор, 2006. – 91с.

**Ігнацюк, А. Нота Ля** : [вершы, паэмы] / Алена Ігнацюк. – Мн. : Медысонт, 2000. – 134 с.












*"Пані Алена вялікая фантазёрка, для паэзіі гэта вельмі важна і вельмі патрэбна, асабліва тады, калі жыццё пхне ў рэальнасць, як статак на кармёшку..."*

*А. Кудравец (ліст)*

# Творчасць

Вершы **Алены Аляксандраўны** друкаваліся ў часопісах «Роднае слова» «Крыніца», «Бярозка», «Нёман», «Маладосць», «Беларусь», «Дзеяслоў», «Полымя», у альманахах «Дзень паэзіі» и «Жырандоля, газетах «Літаратура і мастацтва», «Звязда» і інш..






























# Творчасць

## Супадзенне

З сабой – не супадаю.
З табой – не супадаю.
Не супадаю з целам
і голасам сваім...
З мінулага – сябрамі,
з выявай коткі ў раме...
Не супадаю нават
з часопісам тваім...
Мае несупадзенні
заўважаць святлацені,
святыя дні нядзелі
і белы верталёт...
І спраўдзяцца падзеі –
як воля для надзеі,
як пчолы нагудзелі
ў бліскучых сотах мёд.
Я супаду – з сабою.
Я супаду – з табою.
Як праляціць над полем
белы верталёт.
Ўяўлю – несупадзенні
рабамі на калені
ўпадуць перада мною
на скошаны асот...







## У іншыя тэксты

Экслібрыс,
«ірыска»
і рыска дажджу...
Але пагуляць я цябе не пушчу
у тэксты чужыя...Будзь ў тэксце маім:
у самым пачатку – як той пілігрым.
Дождж мочыць старонку з экслібрысам...Ой?
Давай пагуляем у кнізе маёй!
З радка у радок за сабой цягнем міг,
дзе ты апранаеш мяне ў дажджавік.
Дождж мочыць экслібрыса літару – «Ю» ...
Яе я «ірыскай» няўжо засланю
ад гэткай цягучай,
салодкай вады?

*У іншыя тэксты збіраешся ты...*

# Літаратура аб жыцці і творчасці А. А. Ігнацюк

**Ігнатюк Олена Олександрівна** / І. М. Дзюба // Енциклопедія Сучасної України. – Т. 11. – Київ, 2011. – С.194.

Леонюк, В. **Словник Берестейщини**. – Львів : Видавнича фірма «Афіша», 2010. – 248 с. – Са зместу : [звесткі пра творчасць **Алены Ігнацюк**]. – С.76.

**Алена Ігнацюк** // **Літаратурная карта Берасцейшчыны** / уклад. А. Крэйдзіч. – Брэст : Брэсцкая друкарня, 2008. – 504 с. – Са зместу : [«Асавенія»: верш]. – С. 192–193.

**Беларуская энцыклапедыя :** у 18 т. Т. 18. Кн. 2. ; раздзел «Навука» / Літаратуразнаўства / рэдкал. Г. Пашкоў і інш. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 2004. – 760 с. – Са зместу: [спасылка на творчасць **Алены Ігнацюк** ]. – С. 494.



# Літаратура аб жыцці і творчасці А. А. Ігнацюк



Дзвінская, Э. **Інтуітыўна – пачуццёвая лірыка Алены Ігнацюк** : [ пра паэзію і кнігу Алены Ігнацюк «Дыярыуш для дзівалова»] / Э. Дзвінская // Наша слова. – 2018. – № 22 (1381). – С. 4.

Мазур, П. **Пінськ Олени Ігнатюк: древній і сучасний**: [пра творчасць Алены Ігнацюк / П. Мазур // Вільне життя [Тернопіль, Україна]. – 2018. – № 35. – С. 6.

Расафонаў, А. **Словы і вобразы ў кнігах Алены Ігнацюк** : [пра творчасць Алены Ігнацюк / А. Расафонаў // Драгічынскі веснік. – 2018. – № 47. – С. 3.

Сянкевіч, М. **«Заставацца на сваёй траекторыі»** : [пра кнігу **Алены Ігнацюк** «Дыярыуш для дзівалова»] / М. Сянкевіч // Літаратурная Беларусь. – 2018. – № 5(141). – С. 10.

# Літаратура аб жыцці і творчасці А. А. Ігнацюк



Грышкавец, В. **«Злавіць няўлоўнае, зразумець невыказнае»** : [пра кнігу вершаў **Алены Ігнацюк** «Будзе ўсё наадварот»] / В. Грышкавец // Тэматычны беларускамоўны дадатак «Зари» : Народная трыбуна. – 2017. – 16 сакавіка. – С. 13.

Сівіцкі, У. **«Хараство ацалення і ацаленне хараства»:** [пра кнігу **Алены Ігнацюк** «Будзе ўсё наадварот»] / У. Сівіцкі // Дзеяслоў. – 2016. – № 5(84). – С. 313–318.

Бельскі, А. **Беларуская літаратура пачатку XXI ст**. : традыцыі і наватарства : [склад. А. Бельскі] / вуч. прагр. па спец. курсе ўстан. вышэйш. адукацыі для спец. «Беларуская філалогія» // Беларуская паэзія ў кантэксце антычных традыцый і Еўрапейскіх літаратурных плыняў. – Минск: Беларускі дзяржаўны універсітэт, 2014. – Са зместу : [пра паэтычныя кнігі **Алены Ігнацюк** ]. – С. 13.

# Літаратура аб жыцці і творчасці А. А. Ігнацюк

Філатаў, А. **«Каласы палескага паэтычнага поля»** : [да 55-годдзя пісьменніка М. Сянкевіча і 50-годдзя паэтэсы **Алены Ігнацюк**] / А. Філатаў // Брестский курьер. – 2012. – № 8. – С. 11.

Галубовіч, Л. **«Той свет, дзе можна жыць»** / Л. Галубовіч // ЛіМ. – 2001. – 3 жніўня. – С. 6–7.

Гальпяровіч, Н. **Фантастычны свет** **Алены Ігнацюк** // Голас Радзімы. – 2001. – 14 сакавіка. – С.7.





**Складальнік:**
бібліятэкар 1 катэгорыі Рыбчынская А. А.,
**Бібліятэка Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта.**